# ГАРАДСКАЯ ГАСПАДАРКА МІНСКА Ў 1920-Я гг.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

***Т. У. Пецюкевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, tatstsyana98@mail. ru*

У артыкуле разглядаецца гістарыяграфія і сучасны стан даследавання праблемы развіцця гарадской гаспадаркі Мінска 1920-х гг. Актуальнасць пытання вызначаецца яго ўплывам на жыллёвыя ўмовы гараджан, санітарны стан і ступень добраўпарадкавання тэрыторыі горада. У кантэксце актыўнага пашырэння гарадской інфраструктуры варта звяртацца да вопыту вырашэння аналагічных праблем у мінулым.

***Ключавыя словы:*** гістарыяграфія; горад; гарадская гаспадарка; жыллёвая палітыка; паўсядзённасць.

# PUBLIC UTILITY OF MINSK IN THE 1920-S: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

***T. Petsiukevich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, tatstsyana98@mail. ru*

The article examines the historiography and the current state of the study of the problem of public utility of Minsk in the 1920s. The relevance of the problem is determined by its impact on the housing conditions of citizens, the sanitary condition and the degree of improvement of the city territory. In the context of the active expansion of urban infrastructure, the experience of solving similar problems in the past should be used.

***Key words:*** historiography; city; public utility; housing policy; everyday life.

Праблема гарадской гаспадаркі з’яўляецца актуальнай па прычыне яе прамой сувязі з паўсядзённымі ўмовамі жыцця насельніцтва. Гарадская (камунальная) гаспадарка забяспечвае агульныя бытавыя патрэбы насельніцтва горада і ўключае ў сабе жыллёвы фонд, прадпрыемствы агульнага карыстання (вадаправод, каналізацыя, асвятленне, асенізацыя, лазні, цырульні і г. д.), добраўпарадкаванне тэрыторыі і размеркаванне зямлі горада, дарожныя камунікацыі, гарадскі транспарт. Дзейнасць камунальнай гаспадаркі вызначае жыллёвыя ўмовы гараджан, санітарны стан і ступень добраўпарадкавання тэрыторыі горада.

Сучасны стан даследавання праблемы гарадской гаспадаркі Мінска ў 1920-я гг. і гарадской гаспадаркі гарадоў БССР адпаведнага перыяду ўвогуле характарызуецца адсутнасцю комплексных навуковых прац. Асобныя аспекты пытання разглядаліся як у замежнай, так і айчыннай гістарыяграфіі.

Найбольш распрацаванай складаючай праблемы гарадской гаспадаркі 1920-х гг. з'яўляецца пытанне жылля і жыллёвай палітыкі. Першыя працы па жыллёвай праблематыцы з'явіліся ў савецкі перыяд і былі прысвечаны жыллёваму будаўніцтву, планіроўцы, архітэктурнаму рашэнню дамоў. Да такіх прац адносяцца кнігі архітэктараў А. А. Воінава «Жыллёвае будаўніцтва ў Беларускай ССCР» [6] і Т. С. Страмцовай «Праектаванне і будаўніцтва жылля і грамадскіх будоў у Беларусі» [18]. Аўтарамі разглядаюцца праекты жылля, якое будавалася дзяржавай, кааператывамі і прыватнымі асобамі, аналізуецца праблема пераходу да тыпавога будаўніцтва. Працы такога кшталту даюць уяўленне пра стандарты будаўніцтва, па зменах якіх можна прасачыць перамены ў палітыцы ўладаў і ўзроўні эканамічнага развіцця.

Найбуйнейшым сучасным беларускім даследчыкам жыллёвай палітыкі 1920-х гг. з'яўляецца В. М. Буракоў. Праблема разглядалася аўтарам у дысертацыйным даследаванні «Дзяржаўная жыллёвая палітыка ў БССР у перыяд нэпа (1921–1929 гг.)» [2] і артыкулах «Муніцыпалізацыя жыллёвага фонду ў БССР (1919–1929)» [5], «Кватэрная плата ў БССР у міжваенны перыяд» [3], «Актуальныя праблемы ў вывучэнні жыллёвай палітыкі БССР ў перыяд НЭПа» [1], «Класавы прынцып жыллёвай палітыкі БССР у перыяд НЭПа» [4] і шэрагу іншых. Жыллёвая палітыка вызначаецца даследчыкам як спроба злучэння рынкавых прынцыпаў вядзення гаспадаркі, дэцэнтралізацыі кіравання з дзяржаўным планаваннем і каманднa-адміністратыўным кіраваннем. У якасці шляхоў вырашэння жыллёвага крызісу аўтар называе муніцыпалізацыю, пераразмеркаванне жыллёвага фонда на прынцыпах класавасці і захавання мінімальнай жыллёва-санітарнай нормы. Перасяленні, ушчыльненні, абмежаванне правоў на выкарыстанне нерухомай маёмасці насілі вымушаны характар.

На сучасным этапе ўзрастае цікавасць да чалавека, яго жыцця і побыта. У працах, прысвечаных гісторыі паўсядзённасці, праблема развіцця гарадской гаспадаркі закранаецца як фактар, які шмат у чым вызначаў умовы жыцця насельніцтва. Паўсядзённасці 1920-х гг. у кантэксце гендарных пераўтварэнняў прысвечана праца А. А. Гужалоўскага «Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг.» [7]. Пры аналізе палітыкі «новага побыта», накіраванай на рэфармаванне паўсядзённага жыцця чалавека, закранаецца пытанне сацыялістычных эксперыментаў з жыллём. Моцны станоўчы бок працы – выкарыстанне багатага і разнастайнага фактаграфічнага матэрыялу.

У кантэксце паўсядзённасці варта ўзгадаць працу І. М. Куркова «Мінск незнаёмы» [12], якая ўяўляе сабой збор фотаздымкаў міжваеннага Мінска з уступным артыкулам. Трэба адзначыць, што фота адпаведнага перыяду існуе не шмат, што тлумачылася памежным станам горада. Для аналізу праблемы гарадской гаспадаркі Мінска 1920-х гг. важным даследаваннем з'яўляецца кніга З. В. і С. Ф. Шыбекаў «Мінск: старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада» [18]. Дадзеная праца дае комплекснае ўяўленне аб паўсядзённым жыцці Мінска дарэвалюцыйнага перыяду. У кнізе закранаецца пытанне стану гарадской гаспадаркі, што можа быць скарыстана пры аналізе і параўнанні дарэвалюцыйнага стану развіцця з міжваенным. Пытанню станаўлення і развіцця гарадскога рэйкавага транспарту прысвечана даследаванне Е. Л. Етчыка «Мінск. Ад конкі да метро» [8].

Замежная гістарыяграфія ў межах разглядаемай праблемы прадстаўлена ў асноўным працамі расійскіх гісторыкаў. Дадзеныя работы геаграфічна ахопліваюць межы РСФСР ці СССР цалкам, тэрыторыі БССР надаецца няшмат увагі. Нягледзячы на гэта, у такіх работах прадстаўлены агульныя тэндэнцыі, якія з улікам пэўных асаблівасцяў будуць актуальны і для тэрыторыі Савецкай Беларусі.

Комплекснае даследаванне савецкай гарадской гаспадаркі праведзена І. Б. Арловым у працы [16]. У манаграфіі станаўленне камунальнай гаспадаркі раскрываецца ў кантэксце такіх мадэлей сацыяльна-эканамічнага развіцця, як ваенны камунізм, НЭП, сталінская мадэрнізацыя. Пры гэтым праблема асвятляецца як сукупнасць інстытутаў і з пункту гледжання ўзаемадзеяння з імі насельніцтва. Аўтарам падкрэсліваецца спецыфіка савецкай гарадской гаспадаркі – яе моцна выражаны дзяржаўны характар. Прыкладамі вывучэння развіцця гарадской гаспадаркі з'яўляюцца дысертацыйныя даследаванні А. А. Фалінай [19] і А. А. Кірылавай [9].

Даследаваннем савецкай жыллёвай палітыкі міжваеннага перыяду займаўся М. Г. Меяровіч. Аўтар прапаноўвае ідэю, сутнасць якой заключаецца ў тым, што савецкая ўлада не была зацікаўлена ў вырашэнні праблемы жыллёвага крызісу і выкарыстоўвала жыллё як сродак уздзеяння на «непрацоўных» і «кепска працуючых» [13, с. 5]. У сваіх даследаваннях М. Г. Меяровіч аналізуе праблематыку станаўлення і развіцця канцэптуальнага бачання савецкай уладай гарадской прасторы і ладу жыцця ў ей насельніцтва. Горадабудаўнічыя канцэпцыі новага сацыялістычнага горада ён аналізуе ў шэрагу артыкулаў [14; 15]. У іх

аўтар параўноўвае ідэю горада-саду і сацыялістычнага паселішча, спробы іх рэалізацыі савецкай уладай на практыцы, вынікі апрабацыі ці прычыны адмовы ад ёй.

Буйным даследаваннем па гісторыі паўсядзённасці з’яўляецца праца Н. Б. Лебінай [10], дзе розныя сферы гарадскога жыцця разглядаюцца з пункту гледжання дыхатаміі «анамалія – норма». У межах праблемы гарадской гаспадаркі асаблівую цікавасць уяўляе раздзел, прысвечаны жыллю. У другой сваёй кнізе [11] гэты даследчык у алфавітным парадку змясціў тэрміны, якія шырока выкарыстоўваліся ў паўсядзённым жыцці і грамадскім дыскурсе савецкага перыяду. У тым ліку апісваецца шэраг з’яў, якімі характарызавалася паўсядзённасць 1920-х гг., напрыклад, «мяшчанства», «гаспадарчае абрастанне», «дом-камуна».

Такім чынам, праблема гарадской гаспадаркі Мінска 1920-х гг. прадстаўляецца маладаследаванай тэмай. Актуальнасць пытання вызначаецца не толькі сувяззю з паўсядзённымі ўмовамі жыцця гарадскога насельніцтва, цікавасць да якіх сёння толькі ўзрастае, але і развіццём гарадской гаспадаркі ва ўмовах актыўнага пашырэння інфраструктуры і горада ў цэлым. На сучасны момант адсутнічаюць комплексныя працы, прысвечаныя развіццю як Мінска, так і гарадоў БССР. Найбольш даследаванай сферай з’яўляецца жыллёвая палітыка, некаторыя аспекты разглядаемай праблемы разгледжаны ў працах па гісторыі паўсядзённасці.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Бураков В. Н. Актуальные проблемы в изучении жилищной политики БССР а период НЭПа // Актуальные проблемы в изучении и преподавании общественно-гуманитарных наук (дисциплин): материалы I (Первой) Международной научной конференции, 2–3 декабря 2010 г. – С. 58–59.

2. Бураков В. Н. Государственная жилищная политика в БССР в период нэпа (1921–1929 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07. 00. 02. Минск, 2011. 24 с.

3. Бураков В. Н. Квартирная плата в БССР в межвоенный период // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова: навукова-метадычны часопіс. 2013. № 2. С. 26–32.

4. Бураков В. Н. Классовый принцип жилищной политики БССР в период НЭПа // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна: навукова-метадычны часопіс. 2008. № 3. С. 11–16.

5. Бураков В. Н. Муниципализация жилищного фонда в БССР (1919–1929) // Вестник Полоцкого государственного университета: научно-теоретический журнал. 2013. № 9. С. 106–109.

6. Воинов А. А. Жилищное строительство в Белорусской ССР: [Учеб. пособие для архит. спец. вузов и техникумов]. Минск: Вышэйшая школа, 1980.

7. Гужалоўскі А. А. Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг. Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017.
8. Етчик Е. Л. Минск от конки до метро. Минск: Полымя, 1991.
9. Кириллова Е. А. Городское хозяйство в период становления НЭПа: 1921–1925 гг. (по материалам Петрограда – Ленинграда): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07. 00. 02. URL: https://www. dissercat. com/content/gorodskoe-khozyaistvo-v-period-stanovleniya-nepa-1921-1925-gg-po-materialam-petrograda-lenin/read (дата звароту: 06. 11. 2021).
10. Лебина Н. Б. Повседневная жизнь советского города: Нормы и аномалии. 1920–1930 годы // СПб.: Журнал «Нева». Издательско-торговый дом «Летний Сад», 1999.
11. Лебина Н. Б. Энциклопедия банальностей: советская повседневность: контуры, символы, знаки. СПб.: Дмитрий Буланин, 2006.
12. Мінск незнаёмы, 1920–1940 [Выяўленчы матэрыял]: [фотаальбом] / аўтар-укладальнік Ілля Куркоў. Мінск: Ураджай, 2002.
13. Меерович М. Г. Наказание жилищем: жилищная политика в СССР как средство управления людьми (1917–1937 годы). М: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН); Фонд Первого Президента России Б. Н. Ельцина, 2008. 303 с. .
14. Меерович М. Г. Рождение и смерть города-сада: действующие лица и мотивы убийства // Вестник Евразии. М., 2007. № 1. С. 118–166.
15. Меерович М. Г. Советский рабочий поселок как основной элемент государственной градостроительной политики 1921–1927 гг. // Вестник Южно-Уральского государственного университета. Серия: Строительство и архитектура. Челябинск, 2013. № 2. С. 4–8.
16. Орлов И. Б. Коммунальная страна: становление советского жилищно-коммунального хозяйства (1917–1941). М.: Издательский дом ВШЭ, 2015.
17. Страмцова Т. С. Проектирование и строительство жилых и общественных зданий в Белоруссии. Мн.: Наука и техника, 1965.
18. Шибеко З. В., Шибеко С. Ф. Минск: страницы жизни дореволюционного города. Мн: Полымя, 1990.
19. Фалина Е. А. Жилищно-коммунальное хозяйство городов Чувашской Республики в 1920–1990 гг.: исторический опыт: автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07. 00. 02. URL: https://www. dissercat. com/content/zhilishchno-kommunalnoe-khozyaistvo-gorodov-chuvashskoi-respubliki-v-1920-1990-gg-istoriches/read (дата звароту: 06. 11. 2021).